*Алег Хаменка*

**АРХАІЧНАЯ СВЯТОЧНА-АБРАДАВАЯ АТРЫБУТЫКА БЕЛАРУСКІХ КАЛЯД (*традыцыя і сучасны стан*)**

*У артыкуле разгледжаны найбольш відавочна-«нехрысціянскі», але абавязковы ў паўднёвабеларускай традыцыі атрыбут Каляд – Каза. Яе сімволіка, паводле большасці даследаванняў звязана з тэмамі ўрадлівасці, дабрабыту, прыбытку, «духам збожжа». Аднак існуюць і іншыя погляды на сімвалічнае значэнне Казы, якія таксама разглядаюцца аўтарам дадзенага артыкула.*

*Aleh Khamenko*

**ARCHAIC FESTIVE AND RITUAL PARAPHERNALIA BELARUSIAN CHRISTMAS *(tradition and modern state)***

*The article describes the most «non-Christian», but mandatory in south-belarus Christmas traditions attribute - Goat. Its symbolism, according to most studies associated with fertility themes, prosperity, profit, «grain spirit». However, there are different views on the symbolic meaning of the Goat, which are also considered by the author of this article.*

Самым заўважным «нехрысціянскім» але абавязковым у традыцыі свята сімвалам Каляд з’яўляецца Каза. Каза сімвалізуе ўрадлівасць, дабрабыт, прыбытак, «дух збожжа». Такі падыход да выявы казы самы распрацаваны. Яго прытрымліваліся шэраг знакамітых навукоўцаў сярод якіх Дж. Фрэзер, Б. Рыбакоў, А. Патэбня, М. Грынблат. Ёсць погляд, што Каза з’яўляецца сімвалам сузор’я Казярога [2, с. 41], у якое ўваходзіць сонца з паваротам «на лета» (таму Каза памірае і зноу ажывае). Яшчэ сустракаецца думка, што Каза сімвалізуе эру Казярога, якая надышла, па меркаванні старажытных і сучасных астролагаў, напачатку нашай эры, і скончылася ў 1999 годзе, саступіўшы месца эры Вадалея, але навуковых доследаў на гэту тэму мы не сустрэлі. На наш погляд, адзначаныя падыходы да сімволікі выявы «казы» не канфліктуюць паміж сабою. Яны розняцца навуковай распрацаванасцю. Таму ўзгаданы тут менавіта як версіі.

З другога боку, на вобраз казы ў беларускім фальклоры наклалася яшчэ адна традыцыя, паводле якой: «...Каза – стварэнне чорта, жывёліна, што цесна звязана з нячыстай сілай. Паводле этыялагічнага аповяду (міфа), казу зляпіў чорт, пазайздросціўшы творчаму запалу Бога» [1, с. 211]. Такі падыход да выявы «казы» а таксама маскіраванне, перапрананне ў час правядзення каляднага свята, спрыяла таму, што хрысціянскія святары ніколі не падтрымлівалі «традыцыю народнага святкавання Ражства» дакументальна.

Шмат калядных песен прысвечаны «казе» і «калядзе». Матывы і рытміка гэтых песень часцяком падобныя. Але, амаль кожная вёска мела свае адметнасці ў тэксце, а таксама ў асаблівасцях выканаўчага стылю. Трэба звярнуць увагу на тое, што сярод народных калядных спеваў даволі часта сустракаюцца песні, якія спяваліся як у царкве (касцёле), так і калядоўшчыкамі. Прывяду прыклад: тэкст песні, якая запісана М.Рамашка ў 1987 годзе ў вёсцы Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці ад М. Палагавай: «Добры вечар табе, пане-гаспадару. //Радуйся, радуйся, зямля, Сын Божы нарадзіўся! (паўтараецца пасля кожнага радка) // Засцілайце сталы, усе сколька маем, // Ды кладзіця калачы, святую пшаніцу. // Да прыйшлі к нам жа тры свята ў госці. // А першае свято – Хрыстова раджэнне. // А другое свято – святое Васілле. // А трэцяе свято – Святое Вадохрышча».

Неабходна звярнуць увагу на тое, што паміж гуртамі калядоўшчыкаў у традыцыйных асяродках існаваў дух спаборніцтва: чыё маскіраванне лепш, хто лепш спявае, і нарэшце – хто больш назбірае «каляды». Гэты дух спаборніцтва неабходна захаваць і пры святкаванні ва ўмовах горада. Пры планаванні сапраўды маштабнай каляднай імпрэзы, а мяжа XX–XXI стагоддзяў з’яўляецца сведкам многіх з іх (мал. 1), варта ставіць адпаведныя задачы. Варта прапанаваць, напрыклад, кожнай значнай навучальнай установе сабраць уласны калядны гурт, задача якога адметна «выглядаць» і «гучаць» (што дазволіць захаваць музычную спадчыну і традыцыю маскіравання). З гэтых гуртоў і будзе складацца галоўнае шэсце.

Традыцыя такіх святочных фэстаў даволі шырока распаўсюджана ў гарадах Еўропы. Дастаткова прыгадаць святкаванне дня Святога Марціна ў Германіі, якое заўсёды мае трансляцыю па мясцовым тэлебачанні. І ў сёняшні час, і ў часы савецкай Беларусі форма прамой трансляцыі святкавання ў СМІ была запатрабавана пры правядзенні парадаў працоўных, прысвечаных дзяржаўным святам. Даволі цяжка перанесці ў гарадскія ўмовы цудоўную традыцыю асабістага вітання гаспадара сядзібы. Цалкам грамадства не гатова, на сёняшні час, прыняць за норму турбаваць суседзяў ва ўласных кватэрах нават у святочны дзень, таму тут абыходзяцца папярэдняй дамовай на візіт калядоўшчыкаў.

Вяртаючыся да Казы, варта адзначыць, што ў шэрагу іншых персанажаў каляднай грамады (Мядзведзя, Бусла, Цыганоў, Коніка, Доктара, Салдата, семежаўскіх Калядных Цароў і г. д.), а таксама прылад святочнага інвентара (каляднай зоркі, вяртэпа, калоды), яна выглядае насамрэч найбольш архаічнай і знітаванай з глыбінным, міфарытуальным аспектам каляднага свята постаццю. У манаграфіі В. Калацэя «Параўнальная міфалогія», дзе найбольш знакавыя, супадаючыя з ключавымі момантамі ў святах гадавога кола рытуальныя праявы беларусаў паслядоўна суадносяцца з універсальнай структурай міфаў (апошняя – спадчына маскоўска-тартускай школы семіётыкі і структурнай лінгвістыкі), прыведзена наступнае меркаванне: «У перадкалядную Піліпаўку беларусы спявалі балады, у якіх выкладаўся сюжэт пра барацьбу з дэманічным Цмокам і яго забойства, генетычна знітаванае з эсхаталагічнымі матывамі. Адзін з маскіраваных персанажаў калядных абыходаў вёсак Палесся – Каза – мусіла карнавальна “памерці” і адразу ж “уваскрэснуць” да новага жыцця. Уначы на вёсках ладзіліся імітуючыя Хаос “бясчынствы”… Часова дазволена ўсё, і ў падзвінскай містэрыі-гульні “Цярэшка” нават карнавальна мадэляваліся матывы сімвалічнай імітацыі праміскуітэту» [3, с. 71].

Прыкметы хаатычнасці, парушэння парадку, якія характэрныя абраднасці калядных «Крывых вечароў», а такую назву, дарэчы, носіць адзін з антрапалагічных фільмаў Зінаіды Мажэйкі, прысвечаны беларускім Калядам (мал. 2), В. Калацэй суадносіць з эсхаталагічным міфапаэтычным светасузіраннем, якое ў традыцыі беларусаў захавала своеасаблівыя, надзвычай архаічныя рысы. Аўтар адзначае, што: «па меркаванні Мірчы Эліядэ, для карэнных еўразійскіх светапоглядаў характэрны “Міф пра адвечны зварот” – маўляў, кожны сусвет (у тым ліку і наш) згіне, каб пасля нарадзіўся, праіснаваў, а таксама знік наступны, пасля якога будуць існаваць іншыя» [3, с. 67]. Мадэль такой эсхаталогіі, «пракручаная» з дапамогай сімвалічных рытуальных дзеянняў (адной са складовай якіх паўстае абрадава-гульнёвая смерць і ўваскрашэнне казы), і дэманструецца завадатарамі і ўдзельнікамі калядных абыходаў паўднёвай Беларусі.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2004. – 582 с.
2. Восточнославянский фольклор: Поиски новых подходов / Коллектив авторов. – Молодечно : Победа, 2000. – 240 с.
3. Калацэй, В. Параўнальная міфалогія / В. Калацэй / рэд. С. Канановіч, рэц. Э. Дарашэвіч, Ул. Конан. – Мінск : Зорны верасень; Паркус Плюс, 2009. – 116 с. : іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ